**Майстэрства слова**

Васіль СТАРЫЧОНАК

# ФІЛАСОФСКАЯ ЛІРЫКА РЫГОРА БАРАДУЛІНА ПРАЗ ПРЫЗМУ МЕТАФАРЫ

Народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна можна параўнаць з маэстра, які кіруе вялікім музычна-паэтычным аркестрам пад назвай паэзія. Паэт віртуозна кіруе гукамі, словамі, вобразамі, сімваламі, сказамі, спалучаючы іх у сімфонію гарманічнага і сэнсава-гукавога адзінства, што адлюстроўвае жыццё чалавека на ўсіх ступенях яго развіцця і ва ўсіх іпастасях. І кожны раз маэстра імкнецца напісаць твор, які б знайшоў водгук у сэрцах тысяч чытачоў, дапамог ім адшукаць адказы на вечныя пытанні чалавечага існавання: хто мы такія? дзеля чаго прыйшлі ў гэты свет? у чым сэнс жыцця? што пакінем пасля сябе?

Сёння без перабольшання можна сцвярджаць, што асноўнай у творчасці Р. Барадуліна стала філасофская лірыка. Паэт на палове сёмага дзесятка свайго жыцця можа смела параўнаць дзень учарашні, калі імчаў яго *"жыцця вясёлы воз"*, і дзень сённяшні, калі *"дольку лімонную цыферблата / Рэжа стрэлкі секунднай нож"*. Ідэалізацыя ўчарашніх дзён, юнацкіх гадоў — тэма творчасці многіх пісьменнікаў. І гэта правамерна: маладосць — найлепшая частка чалавечага жыцця, бо ўсім нам у гэтым узросце здаецца, што *"на пачатку далёкі канец"*, што *"на пачатку дарога бясконцая"*. Юнацкія гады ў паэта асацыююцца з звонкарэхім летам: *"Могуло, адплыло маё лета вазамі — / Звонкарэхае, я не збярог"*. У вершы з зборніка **"Самота паломніцтва"** паэт з асаблівай шчымлівасцю гаворыць пра сваё жаданне вярнуцца ў тую пару, на *"бераг юнацтва"*. На жаль, гэта немагчыма:

*А хочацца зачапіцца багром*
*За бераг юнацтва.*
*Час адстае.*
*Багра не стае*[1].

Рыгор, цягні багор...

У многіх творах успаміны лірычнага героя вяртаюць яго на *"паляну роднага краю"*, *"у цесную хату"*, *"сад маленства"*. Вобразна, паэтычна апісаны гэты цудоўны час:

*Мы кожны дзень*
*Туды, туды*
*Вяртаемся ўспамінам,*
*Дзе хрыпне вырай малады,*
*Трымаюць небасхіл сады,*
*Здароўкаюцца халады,*
*Дзе ты*
*Завешся сынам*[2].

Мы кожны дзень...

Паэту і ў сталым узросце саграе душу *"памяць босых ног"*, якая не дае яму адарвацца ад бацькоўскага парога, вытокаў шматплыннай ракі жыцця:

*Хай памяць босых ног*
*Не страціцца нідзе*
*І на чужы парог*
*Цябе не завядзе...*[3].

Памяць босых ног...

Час няўмольна імчыцца наперад, і *"туман гадоў на дне душы гусцее, / З яго саткацца ўрэшце мусіць змрок"*, а *"ўзрост, як шкляр, стараецца хутчэй / Прыцьмела-затуманенай слюдою / Зашкліць усе прынадта маладое, / Адгарадзіць ад рук і ад вачэй"*. Паэт з жалем зазначае:

*Кожную вясну*
*Маіх*
*Вёсен меней, меней —*
*Не бяру ў бэрэма іх,*
*Захінаю... жменяй...*[4].

Кожную вясну...

Лірычны герой у метафарычнай форме гаворыць пра той адмераны Богам час, які застаўся ў яго наперадзе. У гэтай *"рэшце год"*, у апошніх звёнах *"ланцуга жыцця"* чалавек не павінен быць выкінуты з сядла, ён мусіць выстаяць у віхуры жыцця і дапамагчы іншым, скіроўваць іх думкі не на часовыя, а на вечныя жыццёвыя каштоўнасці:

*Хоць век твой — краец веташка,*
*Шлях людзям знач ты, жыцьмеш покі,*
*Каб не разбіцца, як машка,*
*Аб ветравое шкло эпохі*[5].

Хоць век твой — краец веташка...

Матыў суадносінаў жыцця і смерці ніколі не страціць сваёй актуальнасці, чалавек зноў і зноў будзе вяртацца да гэтай вечнай праблемы. У разважаннях пра лёс і прызначэнне чалавека Р. Барадулін спрабуе асэнсаваць вечныя праблемы людскога існавання, маральныя каштоўнасці жыцця, усlавіць веліч духу асобы і яе непераможнасць. Жыццё чалавека на зямлі паэт параўноўвае з бяседай і дзякуе Госпаду за

---

*Звесткі пра аўтара змешчаны ў № 1.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дазвол затрымацца тут. У творах знайшло адлюстраванне і традыцыйна-фальклорнае ўяўленне пра жыццё як час, праведзены ў гасцях: *Я ў гасцях, / Ён бліжэй штогод, / Дзень, / Калі я надзею маю / Зноў сустрэць, як некалі, / Маму; Старэю ў горадзе, / Затрымаўся ў гасцях / Са згоды горада / Ці з ласкі боскай; Адыходзячы з дому, з гасцей, / З пагасцін на зямлі наогул, / Мы забываемся нешта / Абавязкова...* Самыя ж пашыраныя барадулінскія асацыяцыі з паняццем “смерць” не выходзяць за межы такіх агульнавядомых найменняў, як каса, сякера, царства ценяў: *Не звыкшы нікога вініць, / Пракос / Незакончаны скосіць, / Халодна каса зазвініць — / І скосіць...; Чарнобылем, / Як і сосны, / Падсочаныя, / Мы чакаем сваёй сякеры; Бальшыня сваякоў і сяброў / Перасялілася ў царства ценяў.* Параўноўваючы гэтыя два антанімічныя паняцці (жыццё — смерць), паэт заклікае чытача да самасцвярджэння ў зямным і незямным вымярэннях:

*Смерць як жыццё.*
*Жыццё як смерць.*
*І немінучасць і мінучасць.*
*Жыві*
*І ў гэтым свеце сцвердзь,*
*І ў тым*
*Сваю нежывучасць*[6]*.*

Смерць як жыццё...

“Жыццё пражыць — не поле перайсці” — з гэтай народнай мудрасцю нельга не пагадзіцца. Чалавек павінен заўсёды імкнуцца да ідэалу, да таго высокага і прыгожага, што ўзвышае душу, робіць жыццё паўнакроўным, асэнсаваным, змястоўным, бо, як зазначае паэт, “*Чым цягнецца вышэй у неба дрэва — / Глыбей ідуць карэнні у зямлю*”.

У творчасці Р. Барадуліна жыццё чалавека адлюстроўваецца ў непасрэднай сувязі і спалучанасці з навакольным асяроддзем, светам прыроды. Прырода “*з людзьмі жыве супольна, згодна*”. Прыродныя з’явы, як і людзі, размаўляюць, радуюцца, сумуюць, злуюцца, плачуць... З барадулінскіх радкоў можна выразна ўявіць, як *дзень нараджаецца белы, жаўрук наводзіць жалейку, крадзецца цішыня начная, стамлёна дыхаюць хвалі, маланка спрабуе арэхі, ляшчыннік моліцца на лог, завіруха сляды шукае,* як *світанак скрыпіць на сырой назе, поўня лье з даёнкі поўнай малако святла,* як *ад кіслых прысмак журавінавых заплюшчыла сонца вочы,* а *лагчына перасохлая ледзь папярхнулася расой,* як *цыбатай нагой жураўлінаю імшарамі верасень крочыць, бліскавіца стараецца дарэмна сама сябе за локаць укусіць,* якім чынам *сядлае ўсход гарачага каня.* Дарэчы, разнавіднасць метафары, калі неадушаўлёным прадметам, рэчам, раслінам, з’явам прыроды, абстрактным паняццям надаюцца чалавечыя якасці і ўласцівасці, называецца ***персаніфікацыяй*** (ад лац. *persona* асоба, *facere* рабіць), ці ***ўвасабленнем***.

Нямала ў паэзіі Р. Барадуліна прыкладаў, дзе персаніфікацыя выяўляецца ў “камунікацыйнай” формуле, калі навакольныя прадметы “размаўляюць” (гавораць, гамоняць, шэпчуць, пяюць і інш.): *трава з вадой загаварыла; спрабуе змрок загаварыць; гамоніць лес; ды шэпча ў скалы купальскай песні прыбой ласкавы; запяюць на стылым снезе сані; і цень звініць, і дол пяе; забурчыць раззлаваны гром; туга пытае.* Не менш пашыраныя персаніфікацыі з сэнсавым цэнтрам “спаць”, у межах якога вылучаюцца ўсе ступені пачатку і заканчэння (уключаючы сон) гэтага працэсу: супакойвацца, сцішвацца, засынаць, драмаць, начаваць, сніць, прысніць, прачнуцца, абудзіцца. Напрыклад: *засынае возера, ад сіверу сіняе; вячэрняя ціш прыдрамала; чуйна спіць ваколле; спіць яшчэ хмурына дажджавая, што прамые ўся касцей зямлю; спіць на пярынах белых цішыня; і спіцца ліху, покуль ціха; і зоры начуюць у цёмных водах на дне; паклаўшы мех пусты пад галаву, спіць вецер; гораду сняцца і негарадскія сны; у сне пасміхаецца ноч — прыемнае нешта прысніла; а моху скалеламу сніцца: прасунуўся раннем імжыстым упарта-лабаты грыб; заспаныя прачнуліся грымоты; прачнулася світанне.*

У творах паэта прыродныя з’явы і ўсё тое, што акружае чалавека, можа пэўным чынам выяўляць свой унутраны стан, можа смяяцца ці плакаць. У межы дыяпазону гэтых двух антанімічных паняццяў уключаюцца такія градацыйныя кампаненты, як “усміхацца”, “пазіраць з усмешкай”, “захлынацца ад радасці” — “журыцца”, “сумаваць”: *і праз хмары смяюцца зоры; сонца смяецца міла; смяецца ранішнім громам лета; кветкі мне ўслед пазіраюць з усмешкамі; і прыцемна ўсміхнецца небасхіл, аб стому баючыся апячыся; беразняк усмешкай белазубай так і прасмяецца давідна; там плот кожным моцным калом смяецца сабе рэдказуба; смяецца печ — апора хаты — на ўвесь залатазубы рот; як захлынуўся ад радасці жаўранак, славячы сонца вясновага дня; аблачына заплача суха; плакалі ў ціхую ноч цягнікі; і плача слязьмі сухімі кмен з забытай гаспадаркі; журыцца крыніца; сумуе бор пад крак сыты качыны.*

Шырокае выкарыстанне метафар у паэзіі абгрунтавана перш за ўсё самой прыродай гэтай семантычнай універсаліі. Абумоўленая пазнавальнай дзейнасцю чалавека, яго вобразным мысленнем, метафара актыўна ўдзельнічае ў фармаванні асобаснай мадэлі свету, адлюстроўвае навакольны свет ва ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці ўсіх яго элементаў. Самыя пашыраныя і рэгулярныя ў творах Р. Барадуліна метафары паводле вон-

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

кавага падабенства. У формулу такіх метафарычных пераасэнсаванняў уключаюцца кампаненты самых розных тэматычных груп. Так, *абнова* ‘новая рэч’ асацыюецца ў паэта з сакаўной абновай зямлі, яе веснавым покрывам, *акрайчык* хлеба — з акрайчыкам возера (неба, надзеі), *далонь* чалавека — з лістамі дрэў, *змеі* — з тонкімі галінамі сукоў. Значная колькасць метафар на аснове вонкавага падабенства рэалізуецца ў саматычнай мадэлі, калі перанос адбываецца з назваў частак цела чалавека і жывёлаў, напрыклад: *вочы → вочы рэклам, рот → рот печкі, сківіца → сківіца млёна, хвост → хвост ракі (Нёмана), шыя → шыя рачулкі, язык → язык полымя (аблачыны, вадаспада)*.

Філасофскае гучанне ў многіх вершах паэта набываюць квантытатыўныя метафары, заснаваныя на колькасным падабенстве пэўных прадметаў і паняццяў: *воз → воз жыцця, вязанка → вязанка грахоў, мех → мех смутку, пылінка → пылінка існасці, чарада → чарада гадоў (радкоў)* і інш. Узнаўленню пачуцця шчымлівага развітання з родным домам, бацькоўскім парогам садзейнічае ўжыванне паэтам полісеманта *вырай*, адно са значэнняў якога — ‘тыя мясціны, куды выехалі дзеці з бацькоўскай хаты’: *“Бацькі глядзяць на свет шпакоўнямі пустымі, / Адкуль у вырай вымкнулі вясёлыя шпачкі”*. Інтэнсіўнасць дзеяння (яго бурлівасць, імклівы рух) стала прычынай метафарычнага пераасэнсавання полісеманта *вір*. Ва ўспрыманні Рыгора Барадуліна вір — не кругавы рух вады, а *“вір забыцця, вір клопату пустога, вір звягі, вір знявагі”*.

Адметнасць барадулінскіх метафар — разгорнутасць іх структур, у якіх кожны кампанент жыве не сваім уласным жыццём, а ўзаемадзейнічае з іншымі, утвараючы такім чынам цэласны паэтычны вобраз, своеасаблівую аўтарскую перыфразу. Варта заўважыць, што ў такіх структурах могуць збліжацца паняцці, якія ў нарматыўнай літаратурнай мове не атаясамліваюцца. А гэта ёсць адной з прычынаў неаднолькавага прачытання і разумення (нават у разгорнутым кантэксце) тых самых метафар рознымі носьбітамі мовы. Незвычайнасць, свежасць, шматколернасць моўнай палітры, сумежнасць канкрэтных і ўмоўна-абстрактных паняццяў, часам іх супрацьлеглласць і лагічная несумяшчальнасць з’яўляюцца асноўным “будаўнічым матэрыялам” барадулінскіх вобразаў, якія ў той ці іншай ступені дэманструюць індывідуальнасць творчага почырку паэта. Напрыклад: *акіян нематы* ‘далячынь, далёкае мінулае, бездань’; *бераг памяці* ‘тое далёкае і жаданае, што так доўга помніцца’; *ветах жыцця* ‘апошняя частка, квадра жыцця’; *вясло развагі* ‘аснова, прычына для прыняцця пэўных рашэнняў’; *іклы гневу* ‘вастрыня гневу, ад якой неабходна абараняцца’; *невад веры* ‘месца, час, дзе няма падману і табе верацъ’; *пергамент дзён* ‘тое, што зроблена калісьці і з пэўных прычын забытае ці проста непатрэбнае’; *смутак верасу* ‘смутак па восені і тым, што з ёй звязана’; *снег гадоў* ‘значная колькасць гадоў, калі ўжо белымі (сівымі) сталі валасы’.

Многія метафары настолькі разгорнутыя, што іх можна лічыць вобразнымі азначэннямі, абагульненнямі самых разнастайных жыццёвых з’яваў. Такія азначэнні блізкія структурай і сэнсавай напоўненасцю да крылатых слоў, афарызмаў, ці, як яшчэ іх называюць, “залацінак мудрасці”. Прывядзем некалькі прыкладаў: *Вопыт — гэта стома, / Што завецца чуласцю душы; Жыццё ўсё — змаганне з цемраю; Жыццё, як базар, / Дзе заўсёды / Два дурні не прыйдуць да згоды; Радасць — / Жабрачка святая, / Як мае, / Хутчэй раздае; Старасць — / Пераборлівая скнара — / Ведае свой талент дасканала; Востры локаць выраю — / Востры боль.* Некаторыя з такіх выразаў паказваюць асаблівасці менталітэту беларускага народа, яго традыцыі, звычаі, пэўныя асацыяцыі: *Лён — / Апошні сінявокі беларус; Ручнік — ільняная дарога / У цёплых слядах / Ног босых Божых; Непаседа, / Даўгацыбы бусел — / Даўняе вясны / Забыты сон Адама — / Бяроза без верху* і інш. У многіх вобразных азначэннях, здавалася б, даволі суб’ектыўных (аповед у іх вядзецца ад першай асобы), даецца адказ на пытанне, кім звычайна становіцца чалавек ва ўзросце “восені залатой”: *Я — пасівелы бацька дзён маіх, / Дзён маладых, / Што ў свеце разбрыліся; А я, пасівелы дзядоўнік, / Стаю пры апошняй вярсце; Я — / Атожылак толькі, / Які / Цягнецца затрымацца лістамі; Як восеньскі ліст, / Я зялёны, / Але не такі вясёлы.*

Рыгора Барадуліна часта называюць каралём метафар. А метафары, як вядома, не заўсёды ўкладваюцца ў межы строга акрэсленых формаў і мадэляў. І таму ў творах паэта смела і абгрунтавана выкарыстоўваецца як паліфанія вобразна-гукавых і сэнсава-экспрэсіўных сродкаў, так і іх какафонія. Такі знаёмы, прадказальны і зусім незнаёмы, нечаканы віртуоз слова народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін.

---

[1] **Барадулін Р.** Самота паломніцтва. — Мн., 1990. — С. 70.
[2] **Барадулін Р.** Трэба дома бываць часцей... — Мн., 1993. — С. 172.
[3] **Тамсама.** — С. 142.
[4] **Барадулін Р.** Абсяг. — Мн., 1978. — С. 45.
[5] **Барадулін Р.** Трэба дома бываць часцей... — С. 123.
[6] **Барадулін Р.** Евангелле ад Мамы. — Мн., 1995. — С. 157.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ
ЗОК 2069-1
РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ